# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

ISSN 1993-1999

1
2023



# ЗМЕСТ

**2023 — ГОД МІРУ І СТВАРЭННЯ**


СЛОВА ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА

**Аляксандр Корзюк** — **Зварот галоўнага рэдактара да чытачоў** 3

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Вячаслаў Лазіцкі** — **Электронны вучэбна-метадычны комплекс "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" як дыдактычны сродак навучання** 6

САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Сяргей Клішэвіч** — **Роля камсамола Беларусі ў вырашэнні сацыяльных праблем моладзі ў перыяд трансфармацыі савецкага грамадства (1985—1991 гг.)** 10

**ЭТНАКУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ: ПЕРАЕМНАСЦЬ І РАЗНАСТАЙНАСЦЬ**

ЭТНАЛОГІЯ

**Ала Нароўская** — **Традыцыйнае жыллё беларусаў: семіятычны аспект** 17

МУЗЕЯЗНАЎСТВА

**Вераніка Себруковіч** — **Актуальныя формы трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны ў медыяпрасторы музеяў Беларусі** 25

КОЛА ЧАСУ

**Яўген Мікула** — **Папулярызацыя зімовых абрадавых святаў у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту** 32

НАРОДЫ БЕЛАРУСІ

**Наталля Улейчык** — **Сучасныя этнакультурныя працэсы на беларуска-польска-літоўскім памежжы** 35

КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

**Станіслаў РУДОВіЧ** — **Стварэнне дзяржаўнай архіўнай службы БССР у святле новых дакументальных знаходак** 41

МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

**Таццяна Шумель** — **Выніковае абагульненне па гісторыі Беларусі (канец XVIII — пачатак XX ст.)** *(Гісторыя Беларусі, VIII клас)* 52

**Наталья Шиш** — **Германский оккупационный режим на территории Беларуси в 1941—1944 гг.** *(История Беларуси, IX класс)* 60

МАТЭРЫЯЛЫ ДА УРОКАЎ

**Галіна Жураўлёва** — **Крыжаванка па главе "Старажытная Індыя"** *(Сусветная гісторыя, V клас)* 65

**Кроссворд по главе "Древняя Индия"** *(Всемирная история, V класс)* 66

**Крыжаванка па главе "Старажытны Кітай"** *(Сусветная гісторыя, V клас)* 67

**Кроссворд по главе "Древний Китай"** *(Всемирная история, V класс)* 68

**Змест "Беларускага гістарычнага часопіса" за 2022 г.** 69

**Содержание/Summary** 72


***Да ведама аўтараў.*** *Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, давядзенне да ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай версіі часопіса), а таксама на рэдагаванне і скарачэнне матэрыялу па меркаванні рэдакцыі. Папярэджваем аб прававой абароне аўтарскіх правоў на змешчаныя матэрыялы. Передрук магчымы толькі з дазволу рэдакцыі з абавязковай спасылкай на "Беларускі гістарычны часопіс".*



УДК 37.04

**Вячаслаў ЛАЗІЦКІ**
*Загадчык кафедры міжкультурных камунікацый Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: навукова-метадычнае суправаджэнне стварэння і сістэмнага прымянення электронных сродкаў навучання па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах; фарміраванне і развіццё інфармацыйнай кампетэнтнасці як складовай часткі інфармацыйнай культуры асобы; прымяненне тэставых методык педагагічнай дыягностыкі і кантролю ведаў.*
*Аўтар 4 манаграфій, 6 манаграфій у суаўтарстве, 19 дапаможнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі, 5 электронных рэсурсаў, 80 навуковых і навукова-метадычных публікацый.*

# Электронны вучэбна-метадычны комплекс "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" *як дыдактычны сродак навучання*

**З прыняццем вучэбных планаў новага пакалення і ўвядзеннем у адукацыйны працэс ва ўстановах вышэйшай адукацыі (далей — УВА) у 2022/2023 навучальным годзе вучэбнага прадмета "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" актуалізуецца пытанне суправаджэння навучання якасным дыдактычным інструментарыем. Дадзеная праблематыка ўздымалася на дыялогавых пляцоўках па абмеркаванні рукапісу вучэбнага дапаможніка, створанага калектывам аўтараў на чале з доктарам гістарычных навук, прафесарам І.А.Марзалюком. Ва ўмовах рэалізацыі палажэнняў канцэпцыі лічбавай трансфармацыі працэсаў у сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2019—2025 гг. [1], а таксама канцэпцыі аптымізацыі зместу, структуры і аб'ёму цыкла (модуля) сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі [2] па вучэбнай дысцыпліне "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" створаны электронныя вучэбна-метадычныя комплексы (далей — ЭВМК). Іх мэтазгодна разглядаць у якасці сродкаў забеспячэння працэсу арганізацыі і ажыццяўлення навучання студэнтаў УВА.**

**Ключавыя словы:** *інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе, электронны вучэбна-метадычны комплекс, інфармацыйная кампетэнтнасць*

Ва ўстановах агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь распаўсюджана практыка выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін з выкарыстаннем ЭВМК як інструмента адукацыйнай платформы MOODLE (http://moodle.edu.by) [3; 4]. Пад электронным вучэбна-метадычным комплексам намі разумеецца сродак эфектыўнага забеспячэння працэсу навучання і элемент інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Тэхніка-тэхналагічны і дыдактычны патэнцыял ЭВМК вучэбнай дысцыпліны мэтазгодна вызначаць як сукупнасць сістэмных элементаў электроннага адукацыйнага рэсурсу, якія дазваляюць пры наяўнасці неабходных метадычных умоў, эфектыўнага тэхнічнага рашэння і дыдактычнага інструментарыя дасягаць вызначаных мэтаў педагагічнага працэсу [3, с. 6]. Дыдактычная роля ЭВМК заключаецца ў кіраванні працэсам засваення студэнтамі шматкампанентнага складу вучэбных гістарычных ведаў, а таксама ў фарміраванні іх прафесійных кампетэнцый на ўсіх яе этапах пры неабходнай алгарытмізацыі і інструментальным забеспячэнні ўзаемадзеяння выкладчыкаў і студэнтаў.

Створаны калектывам кафедры міжкультурных камунікацый ЭВМК "*Гісторыя беларускай дзяржаўнасці*" [5] з'яўляецца адным з кампанентаў інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. У рамках палітыкі інфармацыйнай бяспекі і аховы аўтарскіх правоў неабходнай умовай паўна-

вартаснага выкарыстання тэхніка-тэхналагічнага і дыдактычнага патэнцыялу ЭВМК кожнаму карыстальніку абавязкова неабходна праходзіць двухфактарную рэгістрацыю ў межах інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя на сайце ПалесДУ.

Праграмны прадукт вучэбнага прызначэння змяшчае арганізацыйныя і сістэматызаваныя тэарэтычныя, практычныя, наглядныя матэрыялы і забяспечвае бесперапыннасць і паўнату працэсу навучання. Распрацоўка і далейшая апрабацыя ЭВМК ажыццёўлена на базе сэрвісу адукацыйнай платформы MOODLE. Аўтарамі ўлічаны дыдактычная роля электроннага адукацыйнага рэсурсу, а таксама крытэрыі структуравання і змястоўнага напаўнення элементаў ЭВМК з улікам палажэнняў вучэбнай праграмы.

Працэс навучання студэнтаў вучэбнай дысцыпліне "*Гісторыя беларускай дзяржаўнасці*" арыентаваны на:
- фарміраванне абгрунтаванай патрыятычнай пазіцыі;
- выпрацоўку сістэмы ведаў па гісторыі беларускай дзяржаўнасці і развіццё ўменняў асэнсоўваць падзеі і з'явы рэчаіснасці ў цеснай узаемасувязі мінулага, сучаснасці і будучыні;
- стварэнне ўстойлівых уяўленняў аб гістарычным шляху і мэтах далейшага развіцця беларускай дзяржавы;
- развіццё навыкаў аргументавана фармуляваць сваю пазіцыю па актуальных пытаннях палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сфер грамадзянскага жыцця.

У структуры і змесце функцыянальнай мадэлі ЭВМК "*Гісторыя беларускай дзяржаўнасці*" улічаны: шматкампанентны склад прапанаваных да засваення вучэбных гістарычных ведаў:
- тэарэтычных (паняцці рознай ступені абагульнення; веды аб працэсах і з'явах; істотныя прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці развіцця; тэарэтычныя высновы, якія змяшчаюць ацэнкі фактаў, характарыстыку іх сутнасных прыкмет, прычын, вынікаў і значэння);
- факталагічных (веды аб канкрэтных падзеях, лакалізаваных у часе і прасторы);
- метадалагічных (веды аб працэсах пазнання, канкрэтных метадах сацыяльна-гуманітарных навук і розных спосабах дзейнасці);
- ацэначных (азнаямленне з рознымі пунктамі гледжання на падзеі, з'явы і працэсы, звязаныя з фарміраваннем і развіццём беларускай дзяржаўнасці) [4, с. 40].

Асноўныя тэматычныя лініі:
- метадалагічныя асновы і перыядызацыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці;
- ключавыя катэгорыі, звязаныя з гісторыяй і дзяржаўным будаўніцтвам Рэспублікі Беларусь;
- характарыстыка канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;
- этапы фарміравання беларускай нацыі;
- гісторыка-рэтраспектыўныя і сучасныя характарыстыкі культурна-цывілізацыйнага развіцця Беларусі.

*Фрагмент інтэрфейсу тэставага комплексу ЭВМК "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці".*



Сістэмнымі перавагамі распрацаванага ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" з'яўляюцца:

- наяўнасць нарматыўнага і дыдактычнага матэрыялу;
- тэхналагічная інтэграванасць у працэс навучання і сістэмнасць;
- наяўнасць зваротнай сувязі ў кіраванні працэсам навучання;
- забеспячэнне студэнтаў пастаяннай інфармацыяй аб бліжэйшых і перспектыўных мэтах навучання і ступені іх дасягнення;
- забеспячэнне засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыялу ў адпаведнасці са шматкампанентным складам вучэбных ведаў (тэарэтычныя, фактaлагічныя, метадалагічныя, ацэначныя веды і спосабы вучэбнай дзейнасці);
- забеспячэнне аператыўнасці пошуку неабходнай вучэбнай інфармацыі;
- аптымізацыя дыягнастычнага і кантрольна-ацэначнага інструментарыя ў адносінах да існуючых патрабаванняў інтэгральнай дзесяцібальнай сістэмы ацэньвання і ўзроўняў засваення вучэбнага матэрыялу;
- магчымасць інтэнсіфікацыі прафесійнай дзейнасці выкладчыка і вучэбнай (у тым ліку і арганізаванай самастойнай) дзейнасці студэнтаў;
- адаптыўнасць у адносінах да магчымых зменаў структуры і зместу адукацыі, патрабаванняў і зместу адукацыйнага стандарту, вучэбнай праграмы і іншай праграмна-метадычнай дакументацыі.

Функцыянальная мадэль прадметнага электроннага адукацыйнага рэсурсу "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" складаецца з наступных модуляў:

- нарматыўны (дакументацыя, якая вызначае змест адукацыі па вучэбным прадмеце, а таксама іншыя праграмна-планаваныя і вучэбна-метадычныя дакументы: вучэбную праграму; крытэрыі ацэньвання вынікаў вучэбнай дзейнасці; спіс рэкамендаваных вучэбных выданняў і інфармацыйных матэрыялаў; пералік пытанняў да заліку (экзамену));
- даведачна-інфармацыйны (элементы дыдактычнага забеспячэння арганізацыі і правядзення вучэбных заняткаў: тэзаўрус — паняційна-тэрміналагічнае структураванне вучэбнага матэрыялу; электронны гласарый, які мае элементы тэарэтычных ведаў і з'яўляецца змястоўным слоўнікам; даведнік па гістарычных персаналіях; даведнік па гістарычнай храналогіі; электронная хрэстаматыя);
- тэарэтычны (адаптаваныя згодна з патрабаваннямі вучэбнай праграмы і вучэбным дапаможнікам электронныя матэрыялы лекцыйнага курса, якія забяспечваюць тэарэтычнае вывучэнне вучэбнай дысцыпліны);
- практычны (матэрыялы семінарскіх (практычных) заняткаў з рэкамендацыямі па эфектыўнай падрыхтоўцы да іх);
- кантрольна-дыягнастычны (варыянты тэматычных і абагульняльных комплексаў разнаўзроўневых тэставых заданняў).

Якасная функцыянальнасць, гнуткасць і магчымасць прапаноўваць выкладчыку інструментарый для стварэння індывідуальнай мадэлі вучэбнага занятку, а студэнтам — рэсурсы для ажыццяўлення самастойнай вучэбнай дзейнасці з'яўляюцца важным метадычным патрабаваннем да ЭВМК *"Гісторыя беларускай дзяржаўнасці"*. Пазначаны намі падыход у трактоўцы дыдактычнай ролі прадметнага ЭВМК, а таксама яго тэхніка-тэхналагічнага і дыдактычнага патэнцыялу і функцыянальнасці дазволіў рэалізаваць модульны прынцып пабудовы адукацыйнага рэсурсу. Рэалізацыя прынцыпу модульнасці дазваляе мінімізаваць праблему актуалізацыі кантэнту з прычыны змянення зместу адукацыі па вучэбнай дысцыпліне.

Змястоўнае напаўненне модуляў прадметнага ЭВМК ажыццёўлена з улікам дыдактычнай накіраванасці і функцый таго ці іншага элемента модуля ў арганізацыі і ажыццяўленні навучання (выстаўленне патрабаванняў да пабудовы зместу навучання; прадстаўленне вучэбных гістарычных ведаў у даведачным і лекцыйным матэрыяле; педагагічная дыягностыка вучэбных дасягненняў і г. д.). Як паказвае практыка распрацоўкі электронных вучэбна-метадычных комплексаў, іх модульнае структураванне дазваляе захаваць іх адкрытасць і адаптыўнасць з улікам магчымай змены структуры і зместу адукацыі, патрабаванняў і зместу адукацыйнага стандарту, а таксама праграмна-метадычнай дакументацыі.

У якасці дыдактычных уласцівасцяў, якія вызначаюць патэнцыял кампанентаў ЭВМК *"Гісторыя беларускай дзяржаўнасці"*, вылучым наступныя:

- кіраванасць працэсам навучання (магчымасць кіравання дзейнасцю суб'ектаў педагагічнага ўзаемадзеяння);
- забеспячэнне сістэмнага падыходу да працэсу навучання (прымяненне кампанентаў ЭВМК у спалучэнні з традыцыйнымі сродкамі навучання на ўсіх этапах арганізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў пры яе алгарытмізацыі);
- здольнасць дасягнення паўнаты засваення ведаў (авалоданне студэнтамі зместам вучэбнага матэрыялу ў адпаведнасці з зададзеным узроўнем яго засваення на прадуктыўных узроўнях);
- індывідуалізацыя навучання (студэнт выбірае і ажыццяўляе патрэбны яму від дзейнасці ў прымальным для яго тэмпе);

– дыягностыка і кантроль вынікаў працэсу навучання (аўтаматызаваны ўлік вучэбных дасягненняў і дынамікі іх змены з дапамогай кантрольна-вымяральнага інструментарыя кантрольна-дыягнастычнага модуля).

Напрыклад, у ходзе падрыхтоўкі да лекцыйных заняткаў па тэматычным раздзеле *"Асноўныя этапы беларускай дзяржаўнасці"* выкладчык вызначае галоўныя тэарэтычныя пытанні лекцыі, звяртаючыся да матэрыялаў нарматыўнага і тэарэтычнага модуляў ЭВМК. У ходзе лекцыі ўвага надаецца засваенню паняційна-тэрміналагічнага апарату (зварот да тэматычнага тэзаўруса і гласарыя даведачна-інфармацыйнага модуля). Зарыентаваць студэнтаў у інфармацыйных крыніцах і вучэбнай літаратуры дазваляе змешчаны ў нарматыўным модуле спіс рэкамендаваных выданняў і матэрыялаў. На ўводнай лекцыі выкладчык арыентуе студэнтаў на падрыхтоўку да семінараў і прапаноўвае рэкамендацыі па эфектыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (зварот да матэрыялаў практычнага модуля ЭВМК). Ажыццяўленне кантрольна-дыягнастычнай дзейнасці па вучэбным прадмеце "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" абумоўлівае зварот да тэставых комплексаў кантрольна-дыягнастычнага модуля.

Да арганізацыйна-метадычных умоў эфектыўнага ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці студэнтаў адносяцца:

– прафесіяналізм выкладчыка і сфарміраванасць у яго інфармацыйнай культуры і прафесійных кампетэнцый;
– суправаджэнне працэсу засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыялу пры камп'ютарнай падтрымцы традыцыйных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу;
– забеспячэнне студэнта інфармацыяй аб бліжэйшых і перспектыўных мэтах навучання, а таксама ступенях іх дасягнення;
– улік высокай матывацыі студэнтаў да навучання з дапамогай інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і тэхнічных сродкаў;
– забеспячэнне праблемна-тэарэтычнага ўзроўню навучання праз абавязковае вызначэнне ў модульных адзінках ЭВМК і засваенне студэнтамі вучэбных гістарычных ведаў тэарэтычнага характару ва ўзаемасувязі з факталагічным зместам вучэбнага матэрыялу;
– рэалізацыя дзейнаснага кампанента прадметнага навучання, арыентаванага на фарміраванне ўменняў працаваць з храналагічным і картаграфічным матэрыялам, а таксама гістарычнымі крыніцамі;
– забеспячэнне эфектыўнасці ў рэалізацыі кантрольна-ацэначнай і карэктавальнай функцый адпаведных модульных адзінак ЭВМК;
– забеспячэнне індывідуалізацыі і магчымасці вызначэння студэнтамі індывідуальнай траекторыі навучання ў межах зададзенага механізма алгарытмізацыі вучэбных дзеянняў;
– наяўнасць інфармацыйнай кампетэнцыі выкладчыка і студэнтаў у межах выкарыстання сродкаў інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;
– наяўнасць інтуітыўна зразумелага і камфортнага для карыстальнікаў дызайнерскага афармлення ЭВМК і яго кампанентаў.

Як сведчыць вопыт, прымяненне ў вучэбным працэсе "Гісторыі беларускай дзяржаўнасці" дазваляе ажыццяўляць эфектыўнае кіраванне вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю студэнтаў, забяспечваючы рацыянальнае спалучэнне яе розных відаў у залежнасці ад вынікаў засваення вучэбнага матэрыялу і асваення адпаведных кампетэнцый. Неабходная эфектыўнасць дасягаецца як якасцю створанага ЭВМК, так і выкананнем адпаведных арганізацыйных і метадычных умоў яго прымянення, з якіх адным з найважнейшых з'яўляецца практычная накіраванасць. Выкарыстанне тэхніка-тэхналагічнага і дыдактычнага патэнцыялу электроннага адукацыйнага рэсурсу ўзмацняе дыдактычную ролю і ў цэлым функцыянальнасць прадметнага ЭВМК у якасці сістэмнага сродку забеспячэння працэсу навучання.

1. Концепция цифровой трансформации процессов в системе образования Республики Беларусь на 2019—2025 годы [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://iso.minsk.edu.by/main.aspx?guid=34963. — Дата доступа : 04.05.2022.

2. Концепция оптимизации содержания, структуры и объема цикла (модуля) социально-гуманитарных дисциплин в учреждениях высшего образования / Министерство образования Республики Беларусь. — Режим доступа : https://www.bsuir.by/m/12_100229_1_162873.pdf. — Дата доступа : 04.05.2022.

3. Аксёнчик, Н. В. Дистанционное обучение в высшей школе. Технико-технологический и дидактический потенциал информационно-образовательной среды УВО / Н. В. Аксёнчик // Народная асвета. — 2020. — № 8. — С. 8—11.

4. Лозицкий, В. Л. Информационно-коммуникационные технологии в вузовском социально-гуманитарном образовании: дидактические аспекты применения облачных сервисов / В. Л. Лозицкий // Вышэйшая школа. — 2014. — № 5. — С. 39—44.

5. Лозицкий, В. Л. История белорусской государственности. Электронный учебно-методический комплекс для студентов учреждения высшего образования / В. Л. Лозицкий [и др.] // E-Learning "Полесский государственный университет". Учебные курсы Moodle [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http ://194.158.204.219/moodle. — Дата доступа : 04.05.2022.

*Паступіў у рэдакцыю 02.09.2022.*